Экспертыза

КУЛЯ ВАЖЫЦЬ НЯШМАТ

ЯК СПЕЦЫЯЛІСТЫ ДАСЛЕДУЮЦЬ ЗБРОЮ?

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі няма вольнага абарачэння агнястрэльнай зброі, пісталеты, рэвальверы, даўгаствольныя стрэльбы перыядычна трапляюць на даследаванне да судовых экспертаў. Сумную «майку лідара» тут трымаюць справы, звязаныя з браканьерствам. Але які шлях праходзіць зброя падчас экспертызы? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» распытаў намесніка начальніка аддзела даследавання зброі цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Аляксея ПАШКЕВІЧА.

Рэха «маўзера»

У калекцыі экспертаў-балістаў ёсць унікальныя для Беларусі прадметы зброі. Адзін з самых рэдкіх экзэмпляраў — амерыканскі рэвальвер «Сміт-весан», які, як мяркуецца, быў зроблены ў 1875—1880 гадах. Зараз пабачыць гэтую зброю вагой паўтара кілаграма можна толькі ў вестэрнах. А апынуўся ён у калекцыі выпадкова. Дзесьці ў Мінску паступіла паведамленне па лініі 102, што ў адной з кватэр адбываецца вялікі сямейны скандал. Супакойваць мужа і жонку адправіўся мясцовы ўчастковы міліцыянер. Зайшоўшы ў кватэру, ён пабачыў рэвальвер. Папрасіў прад'явіць дакументы на яго, але неабходных папер у наяўнасці не аказалася.



Але гэта выпадак унікальны. Куды часцей да экспертаў паступаюць на разгляд вінтоўкі Мосіна і «Маўзер», наганы і маўзеры часоў Першай і Другой сусветных войнаў. Амаль усё гэта — рэха шматлікіх войнаў, якія каціліся ў першай палове мінулага стагоддзя праз Беларусь. Некаторыя экзэмпляры, дарэчы, прыносяць у заводскай змазцы. Праўда, датычыцца гэта болей нямецкай зброі. Падчас аперацыі «Баграціён» нацысты адступалі настолькі хутка, што не паспявалі вывозіць зброю з сабой. І закопвалі скрынкі з ёй у зямлю.

— Разам з тым трэба зазначыць, што вінтоўкі, аўтаматы і пісталеты тых часоў, якія захаваліся ў ідэальным стане, — хутчэй выключэнне з правіла, — кажа Аляксей Пашкевіч. — Часцей за ўсё яны дзесяцігоддзямі ляжалі ў зямлі, нічым не абароненыя. Дажджы, снег «здароўя» зброі не дадаюць. Моцная карозія металічных частак, і ў асаблівасці ствала, — гэта ледзь не стандарт. Некаторыя ўмельцы спрабуюць іх аднавіць. Аднак, як правіла, такія экзэмпляры страляць не здольныя. Ці могуць стрэліць толькі адзін раз: высокі ціск, які ўтвараецца ў ствале, проста разарве крохкі метал. А калі ўлічыць, што казённая частка, на якую ён прыходзіцца, размяшчаецца каля твару стралка, то наступствы могуць быць вельмі сумныя.

Самаробныя агнястрэлы

— Значная колькасць экспертыз у нас звязана з выкарыстаннем самаробнай агнястрэльнай зброі, — працягвае Аляксей Пашкевіч. — Прычым некаторыя экзэмпляры, здаецца, збіралі ледзь не «на каленцы». Дагэтуль робяцца «пугачы», якія былі папулярныя яшчэ ў савецкіх школьнікаў. Гэта жалезная трубка, чымсьці прыматаная да драўлянага корпуса. Канструкцыя прымітыўней няма куды, але адначасова з тым і страшная для таго, хто яе выкарыстоўвае. Асабліва калі трубка доўгі час недзе ржавела. І ў тым месцы, дзе падпальваецца порах, газы проста разрываюць крохкі метал.

Але самаробкі «пугачамі» не абмяжоўваюцца. Напрыклад, у 1970-я з узбраення пачалі масава здымаць наганы. Іх перарабляілі ў газавыя або сігнальныя рэвальверы. Паколькі ўсё гэта ажыццяўлялася ва ўмовах фабрычнай вытворчасці, то тэхнічныя характарыстыкі такой зброі былі зменены незваротна. Сценкі сталі больш тонкія, змяніў форму баёк. Назад з такой зброі зрабіць агнястрэл ужо немагчыма. Але чамусьці распаўсюджана меркаванне, што дастаткова толькі выдаліць перагародкі — і сігнальны пісталет ператворыцца ў баявы. Першы ж стрэл — і такую перароблену другі раз прыладу разарве.

— Ёсць у нас і непрызнаныя майстры збройнай справы, — згадвае эксперт. — Іх бы здольнасці ды ў карысны бок направіць... Згадваецца справа, якая адбылася ў Віцебскай вобласці. Неяк папаўся «чорны капальнік», які шукаў зброю часоў Вялікай Айчыннай. Падчас ператрусу ў яго знайшлі не толькі пісталеты і аўтаматы 40-х гадоў мінулага стагоддзя, але і прыкладна дзясятак вырабаў, якія чымсьці нагадвалі экзэмпляры з амерыканскіх фільмаў. Чаго былі вартыя толькі вінтоўкі-трансформеры, якія шляхам некалькіх простых маніпуляцый можна было скласці. Яшчэ праз нас праходзіла зброя з электрычным распальваннем ад акумулятара.



Таксама быў у нас агнястрэл, сабраны ў тым ліку з поліпрапіленавых труб, якія выкарыстоўваюцца цяпер пры сантэхнічных работах. Але пасля першага ж стрэлу гэтая зброя развалілася.

У ціры ў экспертаў-балістаў усталявана спецыяльная канструкцыя для выпрабавання зброі. Калі пісталет, вінтоўка або стрэльба выклікаюць хоць бы найменшыя падазрэнні — скажам, ёсць мікраскапічны скол на ствале, трэшчына ці нешта яшчэ — або з'яўляюцца самаробнымі, то ў ход ідзе аўтаматыка. Эксперты-балісты падчас выпрабаванняў працуюць у тандэме. Яны апранаюць абарончую экіпіроўку, выходзяць з памяшкання і прыводзяць механізм у дзеянне дыстанцыйна. Для атрымання максімальна падрабязнай карціны робяцца тры стрэлы. Але гэта ў ідэале. У рэальнасці ж можа адбыцца так, што пасля першага ж стрэлу які-небудзь самаробны «пугач» разляціцца на кавалкі. Але сваю місію ўстаноўка ўсё адно выканае. Узор кулі будзе атрыманы, а таксама прыборы вымераюць кінетычную энергію снарада, што і паслужыць падставай для экспертнага заключэння.

Партызанскі падарунак

— Які шлях праходзіць зброя ў руках эксперта?

— Гэта залежыць ад таго, на якія менавіта пытанні хоча атрымаць адказ следства. Напрыклад, вялікую колькасць зброі і патронаў мы даследуем па справах, звязаных з фактамі браканьерства. Спачатку мы ў такім выпадку шукаем адказы на пытанні, ці рабіўся стрэл з гэтай зброі і ці ўвогуле гэтая адзінка прыдатная для стрэльбы? Пасля ўстанаўліваем мадэль і калібр. І толькі пасля гэтага адбываецца кантрольны стрэл. Яго мэта — атрымаць сляды ад праходжання кулі праз канал ствала і ад затвора. Пасля таго як мы атрымалі гэтыя эксперыментальныя ўзоры, пераходзім ужо непасрэдна да куль і гільзаў, знойдзеных на месцы злачынства, і высвятляем супадзенне.

Але бывае і так, што куля ёсць, а «прывязаць» яе да канкрэтнага ствала немагчыма. У такім выпадку яна разам з гільзай трапляе ў рэспубліканскую кулегільзатэку. Там яна і будзе чакаць свайго моманту — пакуль у рукі экспертаў-балістаў не трапіць зброя, з якой яна вылецела.

А вось узнагародная зброя ў даследчыкаў — госць рэдкі. Часцей за ўсё яна паступае да нас пасля спецыяльнай майстэрні, дзе згубіла свае агнястрэльныя ўласцівасці і стала простым масагабарытным макетам. Эксперт, у сваю чаргу, выносіць заключэнне аб тым, што гэты пісталет больш страляць не здольны. І далей ён аддаецца заказчыку. Так праз нас, напрыклад, праходзіў сувенірны пісталет ад нашчадкаў лётчыка, на рукаятцы якога быў выгравіраваны дароўны надпіс ад беларускіх партызан, датаваны 1943 годам...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота атрымана ад ДКСЭ.

НА СТАРТ!

2 снежня пройдзе першая гонка новага сезона Кубка свету па біятлоне

Сёлета першы этап традыцыйна прымае славенская Паклюка. Кубак свету стартуе з сінгл-мікста і змешанай эстафеты. Усяго ж у гэтым сезоне спартсмены будуць спаборнічаць на дзевяці этапах, акрамя Славеніі іх прымуць Аўстрыя, Чэхія, Германія, Італія, Канада, ЗША і Нарвегія. Чэмпіянат свету па біятлоне пройдзе ў шведскім Эстэрсундзе з 7 да 17 сакавіка 2019 года.

Склад зборнай Беларусі на этапе Кубка свету ў Славеніі выглядае наступным чынам: Сяргей Бачарнікаў, Уладзімір Чапелін, Раман Ялётнаў, Антон Смольскі, Максім Варабей, Ірына Крыўко, Дынара Алімбекава, Ганна Сола і Дар'я Юркевіч.

Першы этап Кубка свету па біятлоне ў Славеніі працягнецца 5 снежня індывідуальнай гонкай у мужчын. 6 снежня ў такой жа дысцыпліне выступяць жанчыны. На 7 снежня запланаваны мужчынскі спрынт, а на 8 снежня — жаночы. 9 снежня адбудуцца гонкі пераследу.

«Выходжу з гульні толькі на пазітыве!»

МАКСІМ МІРНЫ АБВЯСЦІЎ АБ ЗАВЯРШЭННІ КАР'ЕРЫ

Яго шлях у вялікім спорце склаў больш за дваццаць гадоў. За гэты час Макс, як прывыклі называць яго многія, стаў першай ракеткай свету ў парным разрадзе і алімпійскім чэмпіёнам у міксце. У яго актыве таксама дзесяць перамог турніраў Вялікага шлема ў парным разрадзе, двойчы Мірны станавіўся пераможцам Выніковага турніру АТР. А ўся напоўненая ўзлётамі і падзеннямі кар'ера пачыналася менавіта ў нацыянальнай зборнай у 1994 годзе. Там Мірны дэбютаваў у 16 гадоў, у адборачных раўндах Кубка Дэвіса. Пасля гэтага ён практычна кожны год уносіў сваю велізарную лепту ў развіццё зборнай роднай краіны.

29 лістапада Максім Мірны апублікаваў адкрыты ліст, дзе паведаміў аб тым, што мае намер завяршыць сваю спартыўную кар'еру. 41-гадовы спартсмен падзякаваў сваім родным, балельшчыкам, дзіцячым трэнерам, настаўнікам падчас прафесійнай кар'еры, кіраўніцтву Беларускай тэніснай федэрацыі, Мінспорту і Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту за падтрымку на працягу 25 гадоў актыўных выступленняў на корце.

«Я хачу паведаміць сёння, я прыняў рашэнне аб тым, што 2018 год быў маім апошнім сезонам у прафесійнай кар'еры. Гэта было цяжкае для мяне рашэнне, улічваючы, што тэніс з'яўляецца маім жыццём з самага ранняга дзяцінства. Я шчаслівы, што мне ўдалося так доўга атрымліваць асалоду ад гэтай гульні!

Выступаючы на асабістых турнірах альбо гуляючы за краіну, я заўсёды ставіўся да сваёй прафесіі з высокай ступенню гонару і павагі, заўсёды працаваў з поўнай аддачай, таму выходжу з гульні без якога-небудзь шкадавання і толькі на пазітыве! Мне ўдалося дасягнуць нашмат больш за тое, пра што малы з Мінска, Беларусі мог марыць, узяўшы ў руку ракетку.

Мой доўгі шлях быў бы немагчымы без пастаяннай падтрымкі маёй сям'і. Я застануся ў вечным даўгу перад сваімі бацькамі, якія мяне з малых гадоў выхоўвалі ў найлепшых спартыўных традыцыях і вучылі жыццю. Мая жонка і дзеці заўсёды мяне напаўнялі неверагоднай падтрымкай і вельмі натхнялі прасоўвацца наперад. Таксама на маім шляху пашчасціла працаваць з цудоўнымі спецыялістамі, якія дапамаглі развіць мае спартыўныя і чалавечыя якасці. Хацелася б падзякаваць і абняць усіх сваіх балельшчыкаў. Вы пасылалі мне сваю любоў і падтрымку. Вы са мной радаваліся перамагаючы, а таксама паднімалі мяне ў розных кутках свету, калі светлая паласа змянялася на цёмную... Вы мне давалі сілы і матывацыю прачынацца і працягваць працаваць. Я буду заўсёды памятаць, як прыемна і адказна выступаць перад вамі, няхай гэта будзе на трэніровачным корце ці пры забітых трыбунах.

Зазіраючы наперад, прыйшоў час пераключацца і прымаць новыя выклікі. Несумненна, я буду сумаваць па гульні і саперніцтву, але я ўсё роўна буду пільна сачыць за тэнісам і атрымліваць асалоду ад сваёй любімай прафесіі побач з кортам», — напісаў Максім Мірны.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.